МГПУ им. И.П.Шамякина

**АТЭІСТЫЧНЫ ТЭРОР НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX СТАГОДДЗЯ**

Прыбыш М. В. (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна)

Культура і адметныя рысы беларусаў фарміраваліся многія вякі, вялікае месца ў гэтым адыграла рэлігія. Паводзіны, уклад жыцця, асаблівасці

светапогляду рэгулявалі дагматыка і асаблівасці веры. Усё гэта пачало разбураць і змяняць новае кіраўніцтва, якое адмоўна ставілася да Бога.

У сувязі з прыходам улады бальшавікоў, якая ўсталявалася на беларускіх землях у першай палове XX ст., рэлігійнае жыццё беларусаў карэнна змянілася. Вера ў Бога і служэнне яму ніяк не маглі ўзаемадзейнічаць з новай ідэалогіяй. Бальшавіцкае кіраўніцтва пачынае "вайну" з царквой як перажыткам царызму. Яно планамерна і бязлітасна знішчае рэлігію як інстытут грамадства і веру ў Бога як натуральны стан людзей. З самага пачатку ўсталявання свайго рэжыму бальшавікі выключаюць царкву з палітычнага і сацыяльнага жыцця людзей.

Юрыдычнае абгрунтаванне праходзіла паэтапна: спачатку выйшаў дэкрэт Саўнаркама ад 23 снежня 1918 г. "Аб аддзяленні дзяржавы ад царквы і царквы ад школы", у Канстытуцыі БССР (1919 г.), якая насіла класавы характар, было аб'яўлена аб пазбаўленні дэмакратычных правоў і свабод тых, хто належыць да класа эксплуатараў, да гэтай катэгорыі адносілася і духавенства. Вярнуць правы можна было толькі шляхам адмаўлення ад веры. Так, у цыркуляры ЦВК БССР ад 26 верасня 1924 г., адрасаваным усім Акрвыканкамам, пазначалася, што "по смыслу основных законов БССР, служители культов лишены избирательных прав постольку, поскольку в настоящее время занимаются служением культу и извлекают нетрудовые доходы. Если же служители культов отказываются от своей должности, совершенно порывают связь с церковной иерархией и переходят к производительному труду, то нет препятствий к восстановлению их в правах гражданства БССР" [3]. У Беларусі дэкрэт Саўнаркама быў прыняты пазней 1 жніўня 1920 г. Звязана гэта было з інтэрвенцыяй палякаў і немцаў на Беларусі. Татальны наступ на пазіцыі царквы пачаўся толькі пасля ўмацавання ўлады саветаў на нашай зямлі. Праз некаторы час дэкрэт рэфарміравалі, у яго былі ўнесены наступныя праўкі: 1) аб забароне вывучэння рэлігіі ў школе; 2) аб забароне пастырскай дзейнасці; 3) аб забароне рэлігійнай агітацыі. На аснове гэтага дэкрэту праводзіліся экспрапрыяцыі прадметаў рэлігійнага культу, закрываліся манастыры, ліквідаваліся духоўныя вучэбныя ўстановы.

З 1922 года ў БССР, УССР і РСФСР праводзілася ўсеагульная экспрапрыяцыя царкоўнай маёмасці пад выглядам барацьбы з масавым голадам ва Украіне і ў Паволжы. Многія вучоныя разглядаюць яе штучны характар, выкліканы самімі ж бальшавікамі. Таксама мела месца здыманне царкоўных званоў на патрэбы індустрыялізацыі. Паралельна з гэтым кіраўніцтва ўчыняла маштабныя судзебныя і пазасудзебныя расправы над святарамі, манахамі, царкоўнымі актывістамі. На 1 студзеня 1920 г. у Беларусі налічвалася 399 папоў, 300 рабінаў, 16 ксяндзоў, 11 пастараў, 1 мула (1 служачы на 9 тыс. чалавек). На 1 студзеня 1939 г. не засталося ні аднаго, з улікам 2 узбуйненняў тэрыторыі Беларусі. За час "Вялікага Сталінскага тэрору (1937–1938 гг.)" органы НКУС арыштавалі 400 святароў і манахаў, 5 арцыбіскупаў. З 1920 па 1929 гг. на тэрыторыі Беларусі было зачынена

МГПУ им. И.П.Шамякина

больш за 60 % храмаў, многія з іх былі ператвораны ў турмы, склады, клубы і г. д. З 1445 праваслаўных храмаў дарэвалюцыйнай Беларусі летам 1938 г. дзейнічала толькі 2 – Мазырскі і Аршанскі [3]. Цікава, што адной з першых задач у рамках аддзялення царквы ад дзяржавы было адбіранне метрычных кніг у касцёлах і цэрквах, перадача гэтых абавязкаў аддзелам ЗАГСаў. Царкоўнікам забаранялася вядзенне метрычных кніг пад пагрозай крымінальнай адказнасці. Адпаведныя нарматыўныя акты былі выдадзеныя органамі НКУС БССР у 1920-я гады. Асаблівай увагай рэпрэсіўных органаў БССР была аддадзена каталіцкаму духавенству з прычыны яго добранадзейнасці і лаяльнасці да савецкай улады. Ствараліся спісы ўніяцкіх, каталіцкіх і евангельскіх хрысціян, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі для выяўлення святароў з антысавецкімі поглядамі. Такія спісы былі створаны ў студзені 1923 г. Цэнтральнай (ліквідацыйнай) камісіяй па аддзяленні царквы і накіраваны ўпаўнаважаным ДПУ БССР. Лёс тых, хто трапляў у спісы, быў вырашаны.

1920-я гады характарызаваліся расколам унутры праваслаўнай царквы. З'явіліся 2 новыя плыні, якія спрачаліся за лёс праваслаў'я – традыцыйнае (ціханаўскае) і абнаўленчае. Абнаўленцы адкрыта выказвалі падтрымку савецкага рэжыму і заклікалі правесці рэформы ў дагматыцы, богаслужэнні і ўкладзе рэлігіі. Гэты раскол падтрымліваўся ўладай для канчатковай дыскрыдытацыі і самаліквідацыі царквы. Абнаўленцы неафіцыйна карысталіся падтрымкай саветаў.

Паралельна з гэтым вялася актыўная антырэлігійная прапаганда. У 1922 г. бальшавікамі было створана ўсесаюзнае таварыства "Союз безбожников" (з 1929 г. – "Союз воинственных безбожников"), яно існавала да 1947 г. і ўключала ў сябе 3,5 млн. чалавек. Выходзілі газеты "Безбожник" (1922–1941 гг.), "Безбожник у станка" (1923–1931 гг.), "Атеист" (1922–1930 гг.) і г. д. Прапаганда вялася ў вельмі грубай форме, абражаючы рэлігійнае пачуццё і асабісты гонар вернікаў. Становішча царквы на тэрыторыі Беларусі крыху палепшылася толькі пасля Другой сусветнай вайны.

Гэты перыяд пакінуў жахлівы адбітак на культуры і гісторыі нашага народа. Іменна ў часы атэістычнага тэрору Беларусь страціла ўнікальныя сярэднявяковыя цэрквы і касцёлы, унікальную багаслоўскую літаратуру, якая з'яўлялася важнейшай крыніцай вывучэння гісторыі нашага народа. Беларусь страціла многа людзей, якія неслі разам з верай асветніцтва, дабрачыннасць і мараль.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Цыпин, В. История Русской Православной Церкви 1917 – 1990 гг. / В. Цыпин. – М.: Издательский дом «Хроника», 1994.

2. Собрание Узаконений и распоряжений рабочекрестьянского правительства БССР. – №19. – 14 декабря 1942.

3. Репрессивная политика советской власти в Беларуси / ред. Андреев В.П. – 2 вып. – Минск: Международное историко-просветительское правозащитное и благотворительное общество "Мемориал", 2007. – 377 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина